Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні і новыя крыміналкі. Пераслед у Беларусі 3 і 4 сакавіка дапоўнена

04.03.2021 **Тэгі**: пераслед, свабода мірных сходаў, затрыманні

Праваабаронцы "Вясны" і валанцёры 3 і 4 сакавіка працягваюць фіксаваць факты палітычнага пераследу ў Беларусі: затрыманні, вобшукі і іншыя формы ціску на грамадзянаў за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволенасць дзеяннямі ўладаў.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам праз тэлеграм-бот @viasna_bot ці на гарачую лінію:

- **+375 44 734 45 51**
- **+375 29 835 94 49**
- Тэлеграм **@ViasnaSOS, @SOSViasna**

Пераслед 4 сакавіка

Паводле інфармацыі гомельскай "Вясны", у 48-гадовага гамельчука **Валерыя Крухмалава** прайшоў агляд. Валера Крахмалава раніцаю па дарозе на працу сустрэлі супрацоўнікі АУС Савецкага раёну, а потым зрабілі агляд у яго кватэры. У выніку забралі ноўтбук, вінчэсцер ад кампутара, яго і жончын тэлефон. Пасля агляду Валера і жонку адвезлі ў АУС. Супругаў апыталі **наконт фотаздымка з бчб-сцягамі, які з'явіўся ў сеціве 10 студзеня**. Супругі Крахмалавы адмаўлялі сваю датычнасць да фотаздымка. Агулам пару пратрымалі да 18.00 і адпусцілі. Пры гэтым вярнулі ім усю канфіскаваную падчас агляду тэхніку.

Па вяртанні дадому супругі даведаліся, што ў іх сваячкі, цёткі Валера Крахмалава таксама адбыўся агляд, а потым і ператрус, пры чым праводзілі яго вельмі старанна. Са словаў пенсіянеркі, міліцыянты зазірнулі нават ў пакункі чая і кавы і наогул "перавярнулі ўсё ў хаце".

У Мінску затрыманы жыхар ЖК «Пирс»праграміст **Ілля Квачэнка,** машыну якога ўчора ноччу канфіскавалі за адмову здымаць БЧБ-сцяг з акна. Яго сёння а 8 гадзіны выклікалі па позве ў РУУС у Ждановічах. Адтуль ён не выйшаў — яго затрымалі да суда. Верагодна, на яго склалі пратакол за несанкцыянаванае пікетаванне па арт. 24.23 КаАП. Суд над ім чакаецца заўтра.

Крымінальную справу палітзняволенага **Сяргея Ціханоўскага** да канца сакавіка перададуць пракурору для накіравання ў суд.Пра гэта заявіў кіраўнік Следчага камітэту **Іван Наскевіч** падчас наведвання «Гомсельмашу», паведамляе sb.by.

Старшыню БАЖ **Андрэя Бастунца** запрасілі ў СК на 10 сакавіка, піша "БАЖ". На мінулым тыдні Беларуская асацыяцыя журналістаў звярнулася ў СК са зваротам, у якім прасіла разблакаваць доступ у офіс арганізацыі, а таксама вярнуць пячатку і статутныя дакументы, якія знаходзіліся ў сейфе.

Сёння старшыні БАЖ Андрэю Бастунцу пазванілі са Следчага камітэта і прапанавал з'явіцца туды раніцай 10 сакавіка, каб прыняць удзел у аглядзе змесціва забранага падчас ператрусу сейфа.

Сёння каля 12 гадзін забралі з працы 42-гадовую **Ірыну Леанідаўну Новік**. Сказалі, што на размову, але на сувязь яна так больш і не выйшла. Увечары яе сваякі паведамілі, што Ірына ўжо дома.

Палітычную блогерку **Вольгу Такарчук** адпусцілі з ІЧУ пад падпіску. Нагадаем, яе затрымалі 2 сакавіка ў межах арт. 391 Крымінальнага кодэкса.

У Скідзелі сёння супрацоўнікі гродзенскага АМАПу ў межах крымінальнай справы затрымалі некалькі мясцовых жыхароў. Дваіх чалавек адпусцілі, а **Іаскевіча Уладзіміра Уладзіміравіча** і **Валерыя Кашава** змясцілі ў СІЗА.

У Брэсце ў межах крымінальнай справы затрымалі брэсцкага актывіста, вядомага сваёй бчб-прычоскай, **Андрэя Прыстаўку**. Меркавана, гаворка ідзе пра крымінальную справу, узбуджаную па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса за нядзельны марш у Курапаты "Дзяды" 1 лістапада, калі Следчы камітэт прызнаў падазраванымі па справе 231 чалавек. **Пазней знаёмыя Андрэя ўдакладнілі, што яго затрымалі за ўдзел у маршы, які адбыўся праз тыдзень — 8 лістапада.** Актывіст за ўдзел у гэтай акцыі адбыў 15-сутачны арышт.

Нагадаем, са жніўня актывіста затрымлівалі за ўдзел у акцыях мінімум сем разоў, а 31 снежня пасля вобшуку ў доме яго бацькоў Андрэя зноў затрымалі і паведамілі, што супраць яго ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 342 Крымінальнага кодэкса. Але пасля адміністрацыйнага арышту яго адпусцілі на волю. Сёння, 4 сакавіка, яго зноў затрымалі. Паведамляецца, што Андрэя збіраюцца перавозіць у Мінск.



Андрэй Прыстаўка. Фота: "Бінокль"

Таксама ў межах крымінальнай справы ў Брэсце затрымалі 28-гадовага **Валерыя Мельнічука**. Гаворка ідзе пра артыкул 293 Крымінальнага кодэкса (удзел у масавых беспарадках). Раней ён быў у статусе падазраванага, а 2 сакавіка яго выклікалі ў мясцовы РАУС, адкуль ён не выйшаў.

У Мінску ў Шабанах каля 17 гадзіны затрымалі **Святлану Гальцаву**. Два супрацоўніка міліцыі яе запрасілі прайсці з імі на гутарку, пасля чаго жанчыну адправілі на Акрэсціна.

Увечары 4 сакавіка ў Наваполацку ў межах крымінальнай справы міліцыя масава затрымлівае мясцовых актывістаў. Ужо вядома пра восемь затрыманых, сярод іх — **Алена Гурчонак, Юлія Шэлепень**. Па папярэдняй інфармацыі, іх затрымалі на 72 гадзіны. Стала вядома, што затрыманым інкрымінуюць артыкул 391 Крымінальнага кодэкса — **абраза суддзі** ў сувязі з ажыццяўленнем ім правасуддзя. Супрацоўнікі правяліператрусы ў **Артура Сінегі** і **Алены Радзьковай**.

У Гомелі затрыманы **Стас Мачалаў і** сябра БСГП **Святлана Якубовіч**. Вядома толькі тое, што яны абодва жывуць у Савецкім раёне.

Пад Мінскам у Мар'яліва каля 22:00 затрыманы **Андрэй Баншчык**. "*Выгульваў сабаку, пад'ехала міліцэйская машына, скруцілі і павезлі*", — распавядае жонка. На яго склалі два пратаколы па арт. 19.1 (хуліганства) і 23.4 (непадпарадкаванне) і змясцілі да суда ў ІЧУ Мінскага раёна на Скарына.

У Мінску ў межах крымінальнай справы затрыманы 33-гадовы **Максім Кавалёў**. Супрацоўнікі КДБ прыйшлі да яго дадому з ператрусам, пасля якога затрымалі Максіма. Вядома, што яму інкрымінуюць "пратэсны" артыкул (293 ці 342 КК). Цяпер Кавалёў знаходзіцца ў ІЧУ на Акрэсціна.

Таксама ў Мінску затрымалі 34-гадовую **Кацярыну Новік**. З Завадскага РУУС яе змясцілі ў ІЧУ на Акрэсціна да суда.

Інфармацыя дапаўняецца.

Пераслед 3 сакавіка

Мінск

Стала вядома, што затрыманую ўчора падчас масавых затрыманняў палітычную блогерку **Вольгу Такарчук** дагэтуль утрымліваюць у ізалятары на Акрэсціна. Па папярэдняй інфармацыі, яе абвінавачваюць у **абразе суддзі** ў сувязі з ажыццяўленнем імі правасуддзя па арт. 391 Крымінальнага кодэкса.



Вольга Такарчук. Скрын з відэа

Па інфармацыі TUT.BY яшчэ на некалькіх затрыманых учора ўзбудзілі крымінальныя справы. Па папярэдняй інфармацыі, **Руслану Літвіну** інкрымінуюць арт. 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады). Са словаў яго жонкі, Руслана забралі раніцай 2 сакавіка "за абразу супрацоўніка міліцыі" — нібыта ён пакінуў пад нейкім допісам у сацсетцы непрыстойны каментар.

Яшчэ адной затрыманай мінчанцы **Кацярыне Карніевіч**, па словах яе мужа, інкрымінуюць арт. 342 КК «Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх». Што паслужыла прычынай — пакуль невядома.

Сёння ноччу ў жыхара ЖК «Пирс» **Іллі Квачэнкі** канфіскавалі аўтамабіль, нібыта за тое, што ён прынцыпова адмовіўся здымаць БЧБ-сцяг з акна, піша "Белсат". Працаўнікі ДАІ адмовілі што-небудзь каментаваць і забаранялі здымаць іх на відэа: *«Не здымайце мяне. Я расцаню гэта як умяшанне ў маю службовую дзейнасць, і вы будзеце прыцягнутыя да адказнасці»*.

Каля 9 раніцы да яго зноў прыехалі супрацоўнікі міліцыі. Спачатку яны грукалі ў дзверы, а потым у кватэры адключылі святло. Потым у квартал прыехала вышка, і Ілля вырашыў сам зняць сцяг, каб яго не сарвалі. Квачэнку ўручылі позву — 4 сакавіка трэба з'явіцца ў РУУС у Ждановічах, піша onliner.by.

Сёння ў Следчым Камітэце дапытвалі старшыню Беларускага ПЭН-цэнтра **Таццяну Нядбай**. Пасля допыту яна выйшла на волю, там у яе ўзялі падпіску аб неразгалошванні. Меркавана, допыт тычыўся "справы Прэс-клуба".

На камісію Мінюста былі выкліканыя **7 адвакатаў**, з іх 3 не прайшлі атэстацыю. На спецыяльную камісію, як паведамляе БелаПАН, выклікаюць адвакатаў, якія вядуць палітычныя справы і не хаваюць сваёй грамадзянскай пазіцыі.

Увечары ў Мінску за адмыванне мурала затрымалі 25-гадовую **Таццяну Белякову**. Да суда з Фрунзенскага РУУС яе змясцілі ў ізалятар.

Па інфармацыі "БАЖ", фотакарэспандэнта газеты «Новы час» **Дзмітрыя Дзмітрыева** выклікаюць 4 сакавіка 9:30 на допыт у Следчы камітэт у якасці падазраванага па арт. 342 КК. За восень 2020 года журналіста некалькі разоў затрымлівалі пры асвятленні акцый, пасля падзеяў 1 лістапада ён адбываў адміністрацыйны арышт і адначасова стаў падазраваным па крымінальнай справе. Як і іншыя калегі, затрыманыя ў той дзень.

Магілёў

Як паведамляе телеграм-канал магілёўскай "Вясны", юрыста магілёўскага аддзялення праваабарончага цэнтра "Вясна" **Барыса Бухеля** выклікалі ў міжраённы аддзел Следчага камітэта на 5 сакавіка. Як мяркуе Бухель, яго, хутчэй за ўсё, будуць дапытваць у межах крымінальнай справы па арт. 342 КК РБ. Па гэтай справе 16 лютага 2021 года па ўсёй Беларусі прайшлі ператрусы ў праваабаронцаў і журналістаў. У тым ліку ператрусу была падвергнутая кватэра Барыса Бухеля.

Салігорск

Як паведамляе салігорск.org, салігорскі актывіст **Уладзімір Шыла** знаходзіцца ў Следчым камітэце болей за 4 гадзіны. Да яго на "гутарку" прыехаў следчы з Мінска. Як піша "Наша Ніва", сямёра міліцыянтаў указалі, што Уладзімір Шыла актыўна ўдзельнічаў у пратэстах у Салігорску 9 жніўня. Пяцёра нават удакладнялі, што ён заклікаў біць шыбы, а таксама штурмаваць будынкі. Спадар Уладзімір кажа, што іх першапачатковыя сведчанні зусім іншымі. Яшчэ двое міліцыянты адмовіліся казаць, што Шыла заклікаў біць шыбы, у пратаколе засталося «прымаў актыўны ўдзел».

Увечары 3 сакавіка Уладзімір Шыла пакінуў краіну, бо з яго не была ўзятая падпіска аб нявыездзе.

Брэст і Бяроза

Учора ў Брэсце, акрамя **Аляксандра Казлянкі,** затрымалі таксама актывістаў анархісцкага руху **Андрэя Марача**, **Данілу Чуля, П. Шпетнага**. Усіх перавезлі з Брэста ў мінскі ізалятар на Акрэсціна. Таксама ў Бярозе быў затрыманы **Мікіта Дранец**. Па папярэдняй інфармацыі, чацвярых чалавек затрымалі ў межах крымінальнай справы ч. 2 арт. 285 Крымінальнага кодэкса (стварэнне злачыннай арганізацыі альбо ўдзел у ёй).

Іўе

Як піша "Белсат", у мястэчку Іўе (Гарадзенская вобласць) распачалі чатыры «палітычныя» крымінальныя справы.Тры – з нявызначанымі ўдзельнікамі. Чацвертая – паводле артыкулу 369 КК РБ («Абраза прадстаўніка ўладаў») супраць **Рэгіны Лавор**, мясцовай актывісткі. Да суда яна застаецца на волі пад закладам 120 базавых.

У Следчы камітэт выклікаюць усіх, хто меў дачыненне да пратэстаў у справе размалявання «Табакерак» у горадзе.

Навагрудак

Па інфармацыі "Радыё Свабода", 3 сакавіка ў Наваградку затрымалі пісьменьніка **Міхася Зізюка**. Яго пакінулі ў ізалятары да суду. Прычыны затрыманьня пакуль невядомыя.

Інфармацыя дапаўняецца.

Затрыманні благераў і адмінаў раённых чатаў, ды іншы пераслед за другога сакавіка

Праваабаронцы "Вясны" і валанцёры 2 сакавіка працягваюць фіксаваць факты палітычнага перасьледу ў Беларусі: затрыманні, вобшукі і іншыя формы ціску на грамадзянаў за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволенасць дзеяннямі ўладаў.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Дзень палітвязняў Беларусі. Да якіх мерапрыемстваў можна далучыцца?



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Сяргей Дубавец – Алесю Бяляцкаму: “Ты зрабіў невераемна шмат для сваёй краіны, але наперадзе ў цябе яшчэ мноства зьдзяйсьненьняў”

"Пасылка як напамін, што мы тут, мы цябе памятаем, калі ласка, трымайся". Цёплая размова пра падрымку са сваякамі палітвязняў

"Крым — гэта ўзор таго, у што можа пераўтварыцца Беларусь". У Вільні адкрылася выстава пра гісторыі крымскіх татар

"Пісаў лісты ў МВФ з заклікамі да ўвядзення санкцый супраць Беларусі, абражаў Лукашэнку": пяць гадоў калоніі прысудзілі мінскаму блогеру

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 28 палітычных зняволеных

Затрыманне спявачкі, новыя "экстрэмісцкія" матэрыялы, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY